Бібліятэка
Палескага дзяржаўнага універсітэта

Кнігі–гэта дзверы, што выводзяць цябе з чатырох сцен.
Яны вучаць цябе, выхоўваюць, з імі ты падарожнічаеш,
марыш, уяўляеш, пражываеш іншыя жыцці,
а сваю памнажаеш у тысячу разоў.
*А. Перас-Рэвертэ*

# Літаратурны гід

Кнігі ад класікі да сучаснасці

# Чытайце **лепшае** з намі

**Паважаныя карыстальнікі бібліятэкі!**
Многія з нас любяць правесці вольны час з цікавай кнігай.
Але як выбраць з мора выдадзенай літаратуры той твор,
што прыйдзецца вам па душы? Для тых, хто любіць
пачытаць добрыя кнігі або, нарэшце, хоча далучыцца
да гэтага займальнага занятку, мы рэалізуем праект
**«Чытайце лепшае з намі: кнігі ад класікі да сучаснасці»**,
у рамках якога штомесяц будзем знаёміць вас з лепшымі
кнігамі рознай тэматыкі з фонда нашай бібліятэкі.



## 5 кніг пра Вялікую Айчынную вайну

Вялікая Айчынная вайна - адно з самых жудасных выпрабаванняў, якія выпалі на долю беларускага народа. Яе цяжкасці і кровапраліцце пакінулі велізарны адбітак у свядомасці людзей і мелі цяжкія наступствы для жыцця цэлага пакалення. Для сучаснай моладзі Вялікая Айчынная вайна – гэта далёкая гісторыя. Менавіта са старонак кніг пакаленне, якое нарадзілася больш чым праз паўвека пасля Перамогі, можа даведацца пра подзвіг савецкіх салдат, мужнасць працаўнікоў тылу, усяго савецкага народа і пераняць эстафету памяці і павагі, стойкасці і гераізму продкаў, іх беззаветнай любові да сваёй Айчыны. Прапануем вашай увазе творы беларускіх пісьменнікаў, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне.















**Адамовіч, А. Я з вогненнай вескі**: дакументальны зборнік / А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2022. - 415 с.




Гэта дакументальны зборнік успамінаў пра вынішчэнне нацыстамі беларускіх вёсак разам з людзьмі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Аўтары сабралі сведчанні цудам ацалелых непасрэдных сведак са 147 вёсак у 35 раёнах Беларусі.

“Я з вогненнай вёскі…” – трагедыя, кніга-памяць, жывы голас людзей, што былі спалены, забіты разам з сям’ёй, разам са сваёй вёскай, і якія – выжылі. Як у прадмове напісалі самі аўтары, у кнігу ўвайшлі ўспаміны толькі тых, якія самі перажылі жудасны лёс сваіх аднавяскоўцаў. На шляху збіральнікаў чалавечай памяці шмат было і такіх вёсак, дзе не ацалеў ніхто. На старонках гэтай кнігі сабраліся людзі, што выйшлі з агню, з-пад зямлі. І гэта – у самым рэальным, не пераносным сэнсе. Людзі з вогненных вёсак сабраліся на старонках гэтай кнігі, каб сведчыць, пытацца, судзіць, каб распавесці тое, пра што ведаць – страшна, а забыцца – небяспечна.

Кніга была ўпершыню выдадзена у 1975 г.

*«Аднак жа ёсць яна, жыве народная памяць — непадкупная памяць пра фашызм гестапаўскі, канцлагерны, хатынскі. Суд народаў не закончыўся ў Нюрнбергу. Ён працягваецца — у памяці народнай. Суд гэты ідзе не толькі дзеля гістарычнай справядлівасці. Ён жывым патрэбен дзеля жыцця. Бо нездарма гаворыцца, што той, хто не памятае свайго мінулага, асуджаны зноў яго перажыць.»*

Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік

**Быкаў, В. Альпійская балада.** Пакахай мяне, салдацік / В. Быкаў. - Минск : Попурри, 2015. - 301 с. - (Мая беларуская кніга).




Васіль Быкаў – імя, вядомае ва ўсім свеце. Ягоная праўда пра вайну заўсёды не проста ўражвала, яна – апякала. Ягоная глыбіня спасціжэння ўзлётаў і падзенняў чалавечае натуры ў нашай літаратуры не мае сабе роўных. Аўтар сам прайшоў дарогамі Вялікай Айчыннай вайны і ведаў пра што піша не па чутках.

У аповесці “Альпійская балада”, напісанай аўтарам у 1963 годзе, расказваецца аб адным невялікім эпізодзе часоў Вялікай Айчыннай вайны. Савецкі салдат Іван уцякае з палону на тэрыторыі Аўстрыі і сустракае такую ж уцякачку італьянскую дзяўчыну Джулію. Яны бягуць ад фашыстаў і знаходзяць сваё каханне. За тры дні, у час якіх разгортваецца дзеянне, героі перажываюць вельмі многа і пакутнага, і шчаслівага. Гэтыя дні падарылі былым вязням канцлагера бязмежную любоў і надзею на выратаванне. У аповесці прыгожа апісаны прырода і зараджэнне пачуццяў, але вельмі цяжка чытаць пра пакуты герояў. Іван трагічна гіне. А Джулія, якая засталася ў жывых дзякуючы Івану, змагла пранесці любоў да яго праз ўсё сваё жыццё.

Васіль Быкаў піша так, што калі чытаеш, то шчыміць сэрца і ціха цякуць слёзы.

*«І ўсё ж няма нічога мілейшага за Радзіму. Цяжкае ўсё забываецца, памятаецца больш добрае. Здаецца, і неба там іншае - ласкавейшае, і трава мякчэйшая, хоць і без гэтых букетаў. І зямля лепш пахне. Я вось думаю: няхай бы зноў усё вярнулася, як-небудзь справіліся б са сваімі бедамі, справядлівей сталі б. Галоўнае, каб без вайны...»*

Васіль Быкаў

**Паэзія перыяду Вялікай Айчыннай вайны**. Т. 19 / рэд. Я. А. Гарадніцкі. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2020. - 831 с. - (Залатая калекцыя беларускай літаратуры).




Кніга выбранай паэзіі перыяду Вялікай Айчыннай вайны – унікальнае выданне ў серыі «Залатая калекцыя беларускай літаратуры». Пад адной вокладкай сабраны творы і хрэстаматыйныя, і малавядомыя, і тыя, якія адносна нядаўна вернуты ў гісторыка-літаратурны кантэкст.

Аўтары зборніка – нацыянальныя класікі, знакамітыя і вядомыя пісьменнікі, а таксама паэты, якія загінулі на фронце. Іх творчасць ваеннага часу аб'яднoўвае трагічнае ўспрыманне падзей, палымяны патрыятызм, услаўленне мужнасці і гераізму ў барацьбе з ворагам, пачуццё непрымання вайны як найвялікшага зла.



*«Нам не забыць ні хат, ні нават траў,*
*Што супастатам спалены, стаптаны,*
*Благаславенне тым, хто ў бітве паў*
*За край, што для жыцця адваяваны.»*

Анатоль Астрэйка

**Хлопцы самай вялікай вайны**: 25 апавяданняў пра Вялікую Айчынную вайну. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2022. - 343 с.




Зборнік склалі апавяданні вядомых беларускіх пісьменнікаў – Кузьмы Чорнага, Васіля Быкава, Івана Мележа, Івана Пташнікава, Івана Чыгрынава, Вячаслава Адамчыка, Міхася Стральцова і іншых, – прысвечаныя тэме Вялікай Айчыннай вайны. У кожнага з аўтараў свая вайна: для адных гэта нялёгкія франтавыя дарогі, для іншых – апаленае дзяцінства. Але ў кожным з іх яна назаўсёды засталася незагойнай ранай, болем, якім пранізаны і напісаныя імі творы.



*«Часцей, часцей прыпамінай...*
*Імёны паўшых смерцю храбрых*
*За родны край, наш мілы край, —*
*Каб над зямлёй, што млела ў ранах,*
*Плыў гэты сіні-сіні ранак,*
*Цвіў гэты белы-белы май, —*
*Часцей, мой друг, прыпамінай!»*

Ніл Гілевіч

**Шамякін, І. П. Трывожнае шчасце**: аповесці / І. Шамякін. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. - 607 с. - (Бібліятэка школьніка).




У пенталогіі «Трывожнае шчасце» народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін, на аснове ўласна перажытага, паказаў лёс усяго пакалення, якое прайшло праз цяжкія выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны і ў нялёгкіх пасляваенных умовах аднаўляла родны край.

У цэнтры падзей аказваецца маладая пара — студэнт Пётр Шапетовіч і фельчар Саша Траянава. Дзеянне аповесцяў ахоплівае вялікі прамежак часу пачынаючы з прадваенных дзён і заканчваючы перыядам аднаўлення краіны. Маладыя людзі пажаніліся, але неўзабаве Пятру прыйшлося пакінуць родны дом, каб аддаць доўг сваёй Радзіме. А Саша засталася разам з грудным дзіцем, патрапіўшы ў акупацыю да ворагаў. Але яны здолелі зберагчы сябе адзін для аднаго.

Аўтар увасобіў тыповыя рысы характару таго пакалення моладзі, на долю якога выпалі цяжкія гады ліхалецця. Героі прайшлі ўсе выпрабаванні жыццём, засталіся вернымі сабе і суровай праўдзе жыцця.

*«Хіба гэта гульня, спаборніцтва, спорт? Вайна, смерць, гора... Хіба можна ў такі час думаць пра нейкую славу, узнагароду? Трэба біць, біць іх больш, ворагаў, што хочуць украсці маё... тваё... наша шчасце.»*

Іван Шамякін





# З прадстаўленымі кнігамі вы можаце азнаёміцца на абанеменце навуковай і мастацкай літаратуры

**Складальнік:**
Бібліятэкар 1 катэгорыі Рыбчынская А.А.,
Бібліятэка Палескага дзяржаўнага універсітэта